


Аляксей КІЛІЧЭНКАЎ, Сяргей НОВІКАЎ

# Пачатак Вялікай Айчыннай вайны:

## сучасная гістарыяграфія і крыніцазнаўства



*КІЛІЧЭНКАЎ Аляксей Аляксеевіч — прафесар кафедры гісторыі Расіі навейшага часу Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта (Масква), доктар гістарычных навук. Нарадзіўся ў 1960 г. у Казахстане. У 1987 г. закончыў Універсітэт дружбы народаў імя П.Лумумбы, з 1990 г. выкладае ў ВНУ. У 1992 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 2010 г. — доктарскую дысертацыю. Займаецца даследаваннем ваеннай гісторыі Расіі, замежнай гістарыяграфіі. Аўтар больш за 100 навуковых і вучэбна-метадычных публікацый, у тым ліку "Краткий курс Великой Отечественной войны" (М., 2008); "Холодная война" в океане: Советская военно-морская деятельность 1945—1991 гг. в зеркале зарубежной историографии" (М.,2009); "Советский флот холодной войны в оценках зарубежной историографии. Основы и возможности исследовательской модели" (М., 2009) і інш.*



*НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч — загадчык кафедры айчыннай гісторыі і сусветнай культуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1954 г. у в.Радзіца Крупскага р-на Мінскай вобл., у 1980 г. закончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М.Горкага. Займаецца даследаваннем эканамічнай гісторыі Беларусі перыяду нацысцкай акупацыі, праблем германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны і крыніцазнаўства. Аўтар манаграфій "Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941—1944 гг.: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў" (Мн., 2002), "Беларусь у кантэксце германскай гістарыяграфіі гісторыі Другой сусветнай вайны" (Мн., 2004). З'яўляецца сарэдактарам навуковых зборнікаў "Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць". Вып. 1—9 (Мн., 2002—2010).*

Сёлета спаўняецца 70 гадоў з пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Многія старонкі гісторыі гэтай вайны ўжо напісаны, аднак спрэчныя пытанні пра падзеі таго часу застаюцца і сёння. Каб іх вырашыць, неабходны пошук новых крыніц, пашырэнне дыялогу паміж даследчыкамі ваеннай гісторыі з розных краін.

2 красавіка 2011 г. у Маскве адбылася канферэнцыя **"Пярэдадзень і пачатак Вялікай Айчыннай вайны: праблемы сучаснай гістарыяграфіі і крыніцазнаўства"**, арганізаваная кафедрай гісторыі Расіі навейшага часу Расійскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта (РДГУ). Яе адметнасцямі былі метадалагічная скіраванасць на разгляд праблем сучаснай гістарыяграфіі і крыніцазнаўства, а таксама ўдзел выключна профільных спецыялістаў — 20 даследчыкаў ваеннай гісторыі.

Адкрываючы канферэнцыю, намеснік старшыні аргкамітэта доктар гістарычных навук **А.А.Кілічэнкаў** адзначыў, што заяўленая для абмеркавання навукоўцамі з Масквы, Мінска і Яраслаўля праблематыка з'яўляецца актуальнай і для навукі, і для грамадства. Да апошняга часу многія пытанні, якія тычыліся падрыхтоўкі да вайны і яе пачатку, заставаліся палітызаванымі, што замаруджвала дасягненне кансенсусу сярод гісторыкаў і ў грамадстве ў цэлым. Таму вельмі неабходна выйсці за рамкі ідэалагічных спрэчак і знайсці надзейны падмурак для сур'ёзнага тэарэтычнага абмеркавання праблем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

На канферэнцыі ў форме пленарных пасяджэнняў у прысутнасці ўсіх удзельнікаў працавалі тры секцыі. На першай з іх — **"Пярэдадзень выпрабаванняў"** — былі прадстаўлены пяць дакладаў.

Старшы навуковы супрацоўнік Інстытута ўсеагульнай гісторыі Расійскай акадэміі навук (РАН) **Ю.А.Нікіфараў** адкрыў канферэнцыю дакладам *"Падрыхтоўка СССР да вайны з Германіяй у 1941 годзе: границы дыскусіі"*. Ён адзначыў важнасць выкарыстання гісторыкамі максімальна поўнага кола гістарыяграфічных і дакументальных крыніц. Даследчык перакананы, што ўсе наяўныя на сённяшні дзень дакументы па ваенна-стратэгічнаму планаванню не могуць дапамагчы адказаць на галоўнае пытанне —

аб прычынах дзеянняў палітычнага кіраўніцтва СССР напярэдадні ваенных выпрабаванняў летам 1941 г. Сёння пры правядзенні грунтоўных навуковых даследаванняў патрабуецца сур'ёзны крыніцазнаўчы аналіз. Ю.А.Нікіфараў прапанаваў наступныя высновы: 1) не падлягае сумненню, што агрэсія Германіі супраць СССР з'яўлялася рэалізацыяй праграмнай устаноўкі А.Гітлера па заваяванню "жыццёвай прасторы" на ўсходзе Еўропы і знішчэнню Савецкага Саюза як нацыянальна-дзяржаўнага фарміравання і сацыяльнай сістэмы; 2) рассакрэчаныя ў 1990-я гг. дакументы ваенна-стратэгічнага планавання не даюць падстаў для сцвярджэнняў аб падрыхтоўцы Савецкім Саюзам нападу на Германію. Больш за тое, няма дастатковых падстаў і для сцвярджэнняў аб падрыхтоўцы Генеральным штабам РСЧА апераджальнага ўдару па сканцэнтраваных каля мяжы нямецкіх войсках; 3) у пачатку 1941 г. кіраўніцтва СССР зрабіла максімум магчымага, каб стрымаць Германію ад ваеннага выступлення, і пачало разгортванне Чырвонай Арміі толькі пасля таго, як абстаноўка стала крытычнай. Але нават высоўваючы войскі да граніцы, Савецкі Саюз прадаўжаў шукаць шляхі пераадолення крызісу мірнымі сродкамі.

У дакладзе прафесара РДГУ **Б.Л.Хаўкіна** *"Распрацоўка планаў германскай агрэсіі супраць СССР. План "Барбароса"* быў агучаны тэзіс аб важнасці вызначэння дакладнага тэрміну азнаямлення з гэтым дакументам вышэйшага палітычнага кіраўніцтва СССР. Па перакананню даследчыка, размова аб распрацоўцы нацыстамі плана вайны супраць Савецкага Саюза мае значэнне не столькі для ліквідацыі "белых плямаў" у ведах значнай часткі грамадства і нават асобных навукоўцаў, колькі для абвяржэння ўсё яшчэ пануючага ўяўлення аб "апераджальным" характары германскага нападу на СССР. Першапачаткова існавала некалькі штабных распрацовак нападу Германіі на савецкую краіну — "Аўфбаў Ост", "Фрыц", "Аператыўны праект "Усход", "Эцюд Лосберга", "Ота". У выніку быў выбраны план "Барбароса". Вядома, што з 9 яго экземпляраў 3 захоўваліся ў асабістых справах вышэйшага кіраўніцтва Германіі, а 6 — у архівах. Пры гэтым экземпляр за №2, які ў 1940 г. паступіў галоўнакамандуючаму сухапутнымі войскамі вермахта В. фон Браўхічу, знаходзіцца ў Расіі. На думку даследчыка, у Маскве поўны тэкст дакумента не бачылі да заканчэння вайны, але дзякуючы намаганням разведкі савецкаму кіраўніцтву сталі вядомы тэрміны рэалізацыі плана, яго асноўныя ідэі і падрабязна некаторыя яго часткі (напрыклад, адносна дзеянняў люфтвафе).

*"Аб мабілізацыйнай гатоўнасці часцей Заходняй асобай ваеннай акругі да пачатку 1941 г."* ішла размова ў выступленні галоўнага спецыяліста Расійскага дзяржаўнага ваеннага архіва **Н.С.Тарховай**. З 1941 г. мінула ўжо 70 гадоў, аднак некаторыя архіўныя справы пад грыфам "сакрэтна" сталі вядомымі навукоўцам толькі нядаўна. Напрыклад, даняенні аб мабілізацыйнай гатоўнасці злучэнняў Чырвонай Арміі, што былі ўведзены ў шырокі навуковы зварот толькі ў 2007 г. дзякуючы сумеснай працы расійскіх і беларускіх гісторыкаў і архівістаў, аўтараў-укладальнікаў зборніка дакументаў "Накануне: Западный особый военный округ (конец 1939 г.—1941 г.): документы и материалы" (Мн., 2007). Публікацыя матэрыялаў дазваляе ўбачыць, якую ацэнку аб мабілізацыйнай гатоўнасці ("гатова", "адносна гатова", "не гатова") атрымалі часці, што напярэдадні вайны ўваходзілі ў склад ЗахАВА.

Старшы навуковы супрацоўнік Галоўнага архіва Масквы **В.А.Арцыбашаў** прапанаваў удзельнікам канферэнцыі даклад *"Стратэгія РСЧА напярэдадні вайны: знішчэнне ці змор?"*. Аналіз вядомых і нядаўна ўведзеных у навуковы зварот матэрыялаў прывёў даследчыка да наступных высноў: 1) напярэдадні вайны ў варыянтах аператыўнага плана, распрацаванага ў Генеральным штабе Чырвонай Арміі, знаходзілі адлюстраванне ідэі наступальнай аперацыі ў стылі стратэгіі змору; 2) закладзены ў аператыўны план асноўны замысел — на першым этапе вайны адрэзаць Германію (лідара варожай кааліцыі) ад балканскіх саюзнікаў і пазбавіць яе эканамічных баз — з'яўляўся арыгінальным, і ў выпадку яго рэалізацыі савецкае Галоўнае камандаванне магло дасягнуць буйных ваенна-палітычных вынікаў; 3) ідэі стратэгіі змору ва ўмовах нанясення праціўнікам галоўнага ўдару на поўнач ад Палесся паставілі Чырвоную Армію ў цяжкае становішча і прымусілі Стаўку ГК перанесці сваю асноўную ўвагу з паўднёва-заходняга стратэгічнага напрамку на заходні.

Загадчык кафедры гісторыі і філасофіі Яраслаўскай дзяржаўнай медыцынскай акадэміі **Н.Ц.Ярэгіна** ў дакладзе *"Медыцына СССР напярэдадні 1941 года: праблемы гатоўнасці да вайны ў ацэнках айчынных гісторыкаў"* засярodзіла ўвагу на тым, што пытанні гатоўнасці медыцынскай службы СССР да вайны ў гістарыяграфіі другой паловы 1940-х—1950-х гг. практычна не асвятляліся. Даследаванні двух наступных дзесяцігоддзяў, якія вылучаліся патрыятычным настроем, толькі між іншым згадвалі аб перадваеннай сітуацыі ў медыцыне. Сур'ёзны штуршок паглыбленаму вывучэнню гісторыі ваеннай медыцыны дала кніга Я.І.Смірнова "Война и военная медицина" (Яраслаўль, 1976). Паводле даследаванняў яе аўтара, у гады вайны 73% параненых байцоў былі вернуты ў строй. У наступныя гады ацэнкі, дадзеныя ў гэтай працы, знайшлі свой працяг. Аднак комплекснага даследавання аб гатоўнасці медыцынскай службы СССР да вайны, якое было б заснавана на новых падыходах і дакументах, да цяперашняга часу няма.

Практычна кожны дакладчык пасля выступлення адказваў на пытанні ўдзельнікаў канферэнцыі, што сведчыла аб пачатку навуковай дыскусіі. Пры гэтым пытанні патрабавалі не столькі звароту да фактычнага матэрыялу ў рамках разгледжанай тэматыкі, колькі яго аналізу ў кантэксце існуючых праблем айчыннай гістарыяграфіі і крыніцазнаўства.

Другая секцыя канферэнцыі пад назвай **"1941 год: Процiборства"** ўключала 11 выступленняў, якія выклікалі асабліва гарачыя спрэчкі сярод удзельнікаў канферэнцыі. Першым значылася выступленне аўтара новай кнігі "Неизвестный 1941. Остановленный блицкриг" (М., 2010) навуковага супрацоўніка Інстытута ваеннай гісторыі Міністэрства абароны РФ **А.В.Ісаева** на тэму *"Прыгранічныя бітвы чэрвеня і пачатку ліпеня 1941 г. Нямецкі погляд"*. Спачатку даследчык звярнуў увагу на асаблівасці савецкіх і нямецкіх дакументаў аб баявых дзеяннях 1941 г.: калі ў данясеннях Чырвонай Арміі падзеі разглядаюцца па днях, дык у нямецкіх дакументах ход баявых дзеянняў фіксуецца літаральна па хвілінах і гадзінах. На думку даследчыка, аб'ектыўная слабасць айчыннай дакументальнай базы аб падзеях лета 1941 г. садзейнічае няправільным ацэнкам і нават шматлікім домыслам адносна прычын паражэнняў Чырвонай Арміі. Захаванасць жа нямецкіх дакументаў стварае ўмовы для дастаткова поўнага адлюстравання баявых дзеянняў часцей і злучэнняў не толькі вермахта, але і Чырвонай Арміі. Вывучэнне нямецкіх дакументаў, па перакананню А.В.Ісаева, прымушае шукаць баланс у ацэнках цэлага шэрага дзеянняў і нават бяздзейнасці часцей і злучэнняў Чырвонай Арміі. Пры гэтым нямецкія аператыўныя дакументы адлюстроўваюць дастаткова высокі ўзровень і арганізацыю супрацiўлення савецкіх часцей у прыгранічных акругах, актыўнасць і асэнсаванасць іх дзеянняў. З дакументаў таксама бачны механізмы дасягнення поспеху германскімі войскамі, дэманструецца ўзровень выкарыстання імі радыёсувязі і разведкі.

Навуковы супрацоўнік навукова-даследчага інстытута ваеннай гісторыі Акадэміі Генштаба Узброеных Сіл РФ **У.А.Літвіненка** звярнуўся да тэмы *"Паражэнне Чырвонай Арміі летам 1941 года: міфы і рэальнасць"*. Ён адзначыў, што цяпер гісторыкі, палітыкі і прадстаўнікі грамадскасці ўсё настойлівей ставяць пытанне аб некампетэнтнасці кіраўніцтва СССР у пытаннях знешняй і ўнутранай палітыкі, аб бяздарнасці ваеннага кіраўніцтва, што быццам і прывяло да жахлівых наступстваў і вялікіх ахвяр у пачатковы перыяд вайны. На думку даследчыка, памылкі сапраўды мелі месца, нельга адмаўляць і сур'ёзныя пралікі ў планаванні і кіраўніцтве войскамі. Аднак, нягледзячы на цяжкае становішча савецкіх войскаў і на катастрофу, якая напаткала Заходні фронт, армія сваю задачу выканала, забяспечыўшы магчымасць для правядзення мабілізацыі і мерапрыемстваў па эвакуацыі ў маштабах усёй краіны, што і адыграла ў рэшцэ рэшт вырашальную ролю ў вайне.

Старшы навуковы супрацоўнік Усерасійскага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы **М.І.Мельцюхоў** прапанаваў даклад *"Да пытання аб прычынах паражэння Чырвонай Арміі ў 1941 годзе"*. Аналіз розных дакументаў і гістарыяграфічных крыніц прывёў гісторыка да высновы, што нямецкі бок зусім не пераўзыходзіў па кольканых паказчыках савецкія войскі, а ўзбраенне працілеглых бакоў было цалкам суадносным па якасных параметрах. Ён прыйшоў да высновы, што тэзіс, які замацаваўся ў найноўшай расійскай гістарыяграфіі аб прычынах паражэння Чырвонай Арміі, звязаных з колькаснай і якаснай перавагай вермахта, не адпавядае рэчаіснасці. Значна больш важнай прычынай паражэнняў РСЧА была слабая аператыўная падрыхтоўка каманднага складу і штабоў рознага ўзроўню.

Галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута расійскай гісторыі РАН **В.С.Хрыстафораў** прадставіў даклад *"Прычыны паражэння Чырвонай Арміі ў пачатковы перыяд Вялікай Айчыннай вайны (па дакументах ЦА ФСБ Расіі)"*. Даследчык паказаў, што цяпер у навуковай літаратуры і ўспамінах удзельнікаў вайны сустракаюцца розныя тлумачэнні паражэння Чырвонай Арміі ў яе пачатку. Аналіз новых дакументаў, перш за ўсё з Цэнтральнага архіва ФСБ Расійскай Федэрацыі, прывёў даследчыка да высновы, што існавалі дзве галоўныя прычыны паражэння: 1) пралік кіраўніцтва СССР адносна тэрміну нападу Германіі. Разведка інфармавала І.Сталіна аб ваенных прыгатаваннях Германіі, часе магчымага нападу, канцэнтрацыі нямецкіх войскаў на савецкай граніцы, аднак некаторыя данясенні разведкі стваралі адчуванне, што падрыхтоўка Германіі да нападу на СССР — гэта дэзінфармацыя; 2) уплыў палітычных рэпрэсій 1937—1941 гг. на боегатоўнасць і баяздольнасць Чырвонай Арміі, маральна-псіхалагічны стан афіцэраў і салдат.

Дацэнт Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта **С.Я.Новікаў** выступіў з дакладам *"Магілёўская бітва 1941 года: міфы і рэальнасць"*, падрыхтаваным на аснове крыніц, якія выяўлены ў калекцыі "Александрыйскія мікрафільмы" Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і ў фондах Федэральнага архіва Германіі ў Фрайбургу. На думку гісторыка, у аснову навуковай канцэпцыі 23-дзённай абароны магілёўскага плацдарма павінен быць пакладзены тэзіс аб "Магілёўскай бітве", паколькі менавіта пад такой назвай гэтая падзея праходзіць у нямецкіх дакументах. Упартыя баі пад Магілёвам сталі галоўнай прычынай выключэння на цэлы тыдзень 7-га нямецкага армейскага пяхотнага корпуса з баёў на маскоўскім стратэгічным напрамку ў ходзе Смаленскай бітвы. У заключэнне гісторык звярнуўся з прапановай аб хадайніцтве навуковай грамадскасці перад кіраўніцтвам Саюзнай дзяржавы аб прысваенні Магілёву звання "Горад воінскай славы".

Дацэнт Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін **М.А.Капылоў** у дакладзе *"Прыбалтыйская асобая ваенная акруга: прычыны няўдач 1941 года"*, разглядаючы даволі супярэчлівую найноўшую літаратуру аб ваенна-палітычнай прысутнасці СССР у прыбалтыйскім рэгіёне, адзначыў, што ўвядзенне новых дакументальных матэрыялаў дазваляе аднавіць рэальную карціну падзей, якія мелі месца ў прыбалтыйскіх краінах і тычыліся абаронных, дыпламатычных і сацыяльных мерапрыемстваў, праведзеных Савецкім Саюзам у 1939—1941 гг. У

выніку ўваходжання Літвы, Латвіі і Эстоніі ў склад СССР была ўсталявана савецка-германская граніца і ўзніклі праблемы па забеспячэнню бяспекі далучаных тэрыторый. Для гэтага ў 1940 г. была ўтворана Прыбалтыйская асобая ваенная акруга. Аналіз матэрыялаў аб падрыхтоўцы акругі да абароны прывёў яго да высновы, што акруга не забяспечыла адбіцця агрэсіі праціўніка 22 чэрвеня 1941 г. Дакументы сведчаць, што ні ваеннае, ні палітычнае кіраўніцтва акругі не былі ў стане правесці наступальныя дзеянні.

У цэнтры ўвагі старшага навуковага супрацоўніка Інстытута расійскай гісторыі РАН **У.А.Артамонава** знаходзілася праблема *"Вермахт і Чырвоная Армія: проціборства духу ў першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны"*. Ён адзначыў, што нацызм умацаваў арыйскую годнасць вермахта, а прапаганда, накладзеная на прыродную ваяўнічасць нямецкага народа, аказала ашаламляльны эфект. У той жа час у шматнацыянальнай Чырвонай Арміі пераемнасці па ваеннай кар'еры амаль не існавала, і большасць афіцэраў паходзілі з рабочых і сялян. Аднак ні рэпрэсіі, ні раскулачванне не змаглі знішчыць савецкі патрыятызм і ікненне да абароны краіны. Ухваленне непераможнасці Чырвонай Арміі ўзмацніла, а не падарвала дух народа. Даследчык прыходзіць да высновы, што ў РСЧА панавала "размытая" псіхалогія, у той час як салдаты вермахта былі падрыхтаваны да найноўшай механізаванай вайны. Тактычная раптоўнасць нападу часова выклікала ступар у камандавання Чырвонай Арміі. Контратакі з'яўляліся выдаткам пераможнага духу і подзвігам адчаю. "Катлы" ўзнікалі не таму, што чырвонаармейцы не жадалі абараняць савецкі лад, а з-за забароны на адступленне. Увядзенне ў Чырвонай Арміі інстытута ваенных камісараў узмацніла дух савецкіх войскаў.

Прафесар РДГУ **Л.А.Малчанаў** асвятліў пытанне *"Калабаранцкі друк аб прычынах паражэння РСЧА ў 1941 годзе"*. Як сведчаць дакументальныя матэрыялы, у агітацыйна-прапагандысцкім апараце, створаным нацыстамі на захопленай савецкай тэрыторыі, асаблівую ролю адыгрывалі калабаранцкія газеты. На іх старонках падзеі вайны набылі тэндэнцыйнае асвятленне, галоўная ўвага акцэнтавалася на адмоўных наступствах шматгадовага ўладарання савецкага таталітарнага рэжыму. Аднак калабаранцкай журналістыцы не ўдалося выклікаць даверу да нямецка-фашысцкіх агрэсараў з боку асноўнай масы насельніцтва акупаваных тэрыторый СССР.

Вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута расійскай гісторыі РАН **А.С.Сеняўская** прапанавала ўдзельнікам канферэнцыі вынікі свайго навуковага пошуку па тэме *"Грамадскія настроі ў СССР летам 1941 года: псіхалагічны шок і яго пераадоленне"*. Даследчыца разгледзела масавую свядомасць савецкага грамадства з пункту гледжання фарміравання вобраза будучай вайны ў перадваенныя гады, звярнула ўвагу на асаблівасці ўспрымання пачатку вайны ў прыгранічных і тылавых раёнах СССР. Пачатак вайны выклікаў у людзей шок, які быў абумоўлены кантрастам паміж даваеннымі ўяўленнямі аб будучай вайне і вайной рэальнай. Абапіраючыся на шматлікія матэрыялы, даследчыца сцвярджае, што грамадству ўдалося пераадолець шокавы стан. У дакладзе паказана, як праходзіў шок, якімі сродкамі ўдалося дасягнуць раўнавагі грамадскай свядомасці.

Супрацоўнік Расійскага навукова-асветнага цэнтра "Халакост" **Л.А.Цярушкін** выступіў з дакладам на тэму *"Маральна-псіхалагічная падрыхтаванасць байцоў Чырвонай Арміі: перадваенная падрыхтоўка і ваенная рэчаіснасць"*, дзе прадставіў аналіз матэрыялаў эпісталярнага жанру — асобных салдацкіх пісьмаў і дзённікаў. У іх сустракаюцца самыя розныя ацэнкі ў дачыненні да нацысцкай Германіі і немцаў: запісы аб тым, што "вайна хутка скончыцца", "немцы будуць здавацца ў палон", ім неабходна "павярнуць зброю супраць сваіх прыгнятальнікаў". Расказваецца ў пісьмах і аб падрыхтаванасці байцоў Чырвонай Арміі. Напрыклад, байцы будаўнічых батальёнаў, месцам дыслакацыі якіх былі новыя прыбалтыйскія рэспублікі, пісалі, што зусім не былі ўзброены. Многія вайсковыя часці як раз у ноч на 22 чэрвеня не змаглі выйсці на тактычныя вучэнні, паколькі машыны ў парках не былі запраўлены. Да ўсяго іншага, савецкія салдаты не ведалі свайго праціўніка.

Пра *"Асаблівасці маральна-псіхалагічнага стану савецкага грамадства напярэдадні і ў пачатку вайны"* дакладваў вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута расійскай гісторыі РАН **В.М.Зямскоў**. Ён адзначыў, што на працягу года напярэдадні вайны і ў грамадстве, і ў палітычнага кіраўніцтва расло адчуванне ваеннай пагрозы. Вайна ўяўлялася верагоднай, але не непазбежнай. У размовах рабочых, сялян, служачых, інтэлігенцыі праціўнікам у будучай магчымай вайне часам згадваліся Японія і Вялікабрытанія, аднак часцей за ўсё — Германія. Праведзеныя ў студзені 1941 г. маштабныя ваенныя вучэнні, на якіх адпрацоўваўся сцэнарый адбіцця нямецкай агрэсіі, яскрава паказвалі, што кіраўніцтва СССР не памылялася адносна таго, хто стане галоўным праціўнікам у вайне. Аднак у краіне панавалі ўяўленні, што вайне з Германіяй будуць папярэднічаць якія-небудзь патрабаванні, разрыў дыпламатычных адносін, афіцыйная адмена дзеяння пакта аб ненападзенні ад 23 жніўня 1939 г. і г.д. Такога сцэнарыя ўварвання, які меў месца 22 чэрвеня 1941 г. — раптоўнага нападзення, — ніхто не прадбачыў. Гаворачы аб антысавецкіх, антыбальшавіцкіх і антысталінскіх настроях, якія таксама мелі месца ў грамадстве, даследчык адзначыў, што нельга перабольшваць іх маштабы. Большасць насельніцтва падтрымлівала савецкі лад, людзі былі гатовы абараняць не толькі сваю Радзіму, але і існуючую ў СССР грамадска-палітычную сістэму.

Трэцяя секцыя канферэнцыі пад назвай **"1941 год у гістарычнай памяці"** была прысвечана сучасным праблемам гістарычнай памяці. З першым дакладам *"Гісторыя Халакосту на тэрыторыі СССР у 1941 г. у кантэксце процідзеяння міфам аб Вялікай Айчыннай вайне"* выступіў галоўны рэдактар энцыклапедычнага выдання "Холокост на территории

СССР" (М., 2009) прафесар РДГУ **І.А.Альтман**. Ён адзначыў, што ў савецкай гістарыяграфіі практычна за ўвесь пасляваенны перыяд існавання СССР адсутнічалі спецыяльныя даследаванні аб генацыдзе савецкіх яўрэяў. Гэта тэма доўгі час заставалася "белай плямай" і ў постсавецкай Расіі. Сучаснае даследаванне гісторыі Халакосту адметна тым, што дапаўняе гістарыяграфію аб нацысцкім рэжыме на акупаванай тэрыторыі СССР.

З дакладам *"Заградатрады Чырвонай Арміі летам 1941 года: гістарычны міф, сучасная гістарыяграфія, архіўныя дакументы"* выступіў саіскальнік Маскоўскага дзяржаўнага гуманітарнага ўніверсітэта імя М.А.Шолахава **У.В.Фядзюнін**. На яго думку, загараджальныя атрады Чырвонай Арміі (потым яны перайшлі ў склад НКУС) сталі першымі часцямі, якія ўзялі на сябе функцыю аховы вайсковага тылу дзеючай арміі. У савецкай гістарыяграфіі Вялікай Айчыннай вайны пра гэта не пісалася. У літаратуры апошніх гадоў гэта праблема асэнсоўваецца з пункту гледжання асуджэння і абвінавачвання, паколькі заградатрады (пазней — войскі па ахове тылу) разглядаюцца як карная сіла ў руках савецкага камандавання, якая прымушала (пад пагрозай расстрэлу) змагацца за ўтрыманне пазіцый ці ісці ў наступленне. Аўтар абвяргае гэта сцвярджэнне на аснове новых дакументаў, у апошні час рассакрэчаных у Цэнтральным архіве Міністэрства абароны РФ. На прыкладзе дзейнасці штаба загараджальнага атрада Заходняга фронту ў Талачыне даследчык паказвае, што суровая абстаноўка, якая складвалася на савецка-германскім фронце і ў савецкім прыфрантавым тыле ў Беларусі, патрабавала рашучых дзеянняў і бязлітасных мер у адносінах да тых, хто ў цяжкі момант, калі вырашаўся лёс краіны, не толькі не жадаў ваяваць з ворагам, але і станавіўся яго памагатым. У.В.Фядзюнін сцвярджае, што заградатрады Чырвонай Арміі сталі неабходнымі фарміраваннямі для вырашэння адной з цяжкіх задач надзвычай складанага пачатковага перыяду вайны — аховы прыфрантавога тылу і падтрымкі яго жыццядзейнасці.

Навуковы супрацоўнік Інстытута навуковай інфармацыі і грамадскіх навук **М.М.Мінц** звярнуўся да праблемы *"1941 год у інтэрпрэтацыі сучаснай гістарыяграфіі"*. Гаворачы аб цяжкасцях, з якімі часта сутракаюцца даследчыкі, прамоўца адзначыў маруднае рассакрэчванне архіўных дакументаў, дэфіцыт кваліфікаваных кадраў і вяртанне да стэрэатыпнай ідэі аб неабходнасці апраўдання савецкай палітыкі. Сярод асноўных тэм гістарыяграфіі даследчык называе савецкую знешнюю палітыку і ваеннае будаўніцтва напярэдадні вайны, ход баявых дзеянняў летам—восенню 1941 г., прычыны няўдач Чырвонай Арміі. Новымі тэмамі для расійскіх даследчыкаў бачацца наступныя: гісторыя паўсядзённасці, уяўленні савецкай ваеннай і палітычнай эліты аб вайне, гісторыя савецкай прапаганды ў перадваенныя гады. Даследчык таксама адзначыў новыя тэндэнцыі, якія ў апошні час сталі характэрныя для расійскай гістарыяграфіі: значна пашырылася база архіўных крыніц для даследавання падзей 1941 года, даследчыкі сталі больш актыўна выкарыстоўваць нямецкія дакументальныя крыніцы, робяцца захады па пераадоленню падзелу на "савецкую" і "германскую" школы вывучэння гісторыі Другой сусветнай вайны.

Прафесар Яраслаўскага вышэйшага зенітнага ракетнага вучылішча супрацьпаветранай абароны **С.Р.Асьмачка** выступіў з дакладам *"1941 год і Перамога: метадалогія міфа і навуковага пошуку"*. Ён адзначыў, што для змены ў значнай ступені статычнага, строга іерархізаванага і табуізаванага гістарычнага вобраза Вялікай Айчыннай вайны сучасным даследчыкам неабходна адмовіцца ад падмены аналізу якасных характарыстык вайны колькаснымі, не блытаць уласна гістарычныя і ваенна-гістарычныя падыходы, шырэй вывучаць гісторыю паўсядзённасці, вызначыць рэальнае значэнне ўрокаў 1941 г., асабліва ў аспекце пошуку стратэгій нацыянальна-патрыятычнай кансалідацыі сучаснага грамадства.

У заключэнні канферэнцыі яе ўдзельнікамі было зроблена падсумаванне асноўных вынікаў. А.В.Ісаеў выказаўся за наданне большай увагі "нямецкаму погляду" на гісторыю вайны. Сучасным даследчыкам неабходна прыкладаць намаганні для таго, каб зблізіць пазіцыі розных школ па падзеях вайны. С.Я.Новікаў прапанаваў пашырыць кола ўдзельнікаў падобных абмеркаванняў, у першую чаргу запрасіць нямецкіх гісторыкаў. А.С.Сяняўская выказала пажаданне, каб у Беларусі было ўведзена званне "Горад воінскай славы". На яе тэрыторыі, дзе ёсць Горад-герой Мінск і Брэсцкая крэпасць-герой, існуе нямала іншых населеных пунктаў, якія заслугоўваюць такога ганаровага звання, — напрыклад, Магілёў, які герäічна абараняўся летам 1941 года.

Падсумоўваючы вынікі работы канферэнцыі, А.А.Кілічэнкаў адзначыў, што яе ўдзельнікі шукаюць шляхі для вырашэння наспелых навуковых праблем. Пры гэтым відавочна, што некаторыя праблемы немагчыма вырашыць традыцыйнымі метадамі. Падзеі Вялікай Айчыннай вайны неабходна разглядаць у кантэксце новых міждысцыплінарных падыходаў. Сённяшні дзень патрабуе сістэмных навуковых публікацый, а абмеркаванне гісторыкаў паказвае адсутнасць цэлага шэрага неабходных крыніц.

Галоўны вынік канферэнцыі заключаецца ў тым, што сёння гісторыкі прыйшлі ў **пачатак шляху** — звярнуліся да той базы крыніц, якая дае магчымасць паглядзець на падзеі вайны пад розным вуглом. Яна дапамагае ўбачыць "нямецкі погляд" на вайну, які існуе ў замежнай гістарыяграфіі. Неабходна нанава распрацаваць тэорыю і метадалогію даследавання вайны. Даследчыкі стаяць перад новым этапам у гістарычнай навуцы, калі неабходна вырашыць цэлы шэраг праблем тэорыі, метадалогіі і крыніцазнаўства дзеля таго, каб адбывалася прырашчэнне выключна навуковых ведаў. Без гэтага немагчыма зрабіць наступны крок, а толькі магчыма хадзіць па замкнёнаму кругу ідэалогіі, калі міфы выступаюць супраць антыміфаў. Для даследчыкаў жа ў першую чаргу важны не ідэалагемы, а навуковая ісціна.





Бібліятэка МДЛУ